*А.Я.Паўлава*
(Мінск)

# Да пытання аб асабістых архівах. Дакументы роду Тышкевічаў

Жыццё знакамітых і цікавых асоб заўсёды знаходзіцца ў цэнтры ўвагі грамадства. Іх асабістыя дакументы – лепшыя захавальнікі памяці аб дзейнасці, творчых фантазіях, дасягненнях і заслугах. Многія выдатныя дзеячы ў мінулым з вялікай увагай ставіліся да асабістых архіваў, збіралі і захоўвалі іх, стваралі унікальныя калекцыі і цэлыя музеі. Іван Грыгаровіч, Аляксандр Ельскі, Браніслаў Эпімах-Шыпіла, браты Луцкевічы, зборы якіх вядомы і далека за межамі іх прыватных уладанняў. Час не быў літасцівы да унікальных калекцый: некаторыя страчаны цалкам, некаторыя дайшлі толькі невялікімі фрагментамі.

Пачынаючы з XVI ст., асноўным відам прыватнаўласніцкага архіва на беларускіх землях з’яўляўся фамільны архіў. Архівы Радзівілаў, Сапегаў, Храптовічаў, Любецкіх і іншых, у склад якіх уваходзілі дакументы больш трох пакаленняў сям’і. Сярод іх маглі аказацца дакументы роднасных сем’яў, звязаных шлюбамі. Фамільныя роды характарызуюць узровень грамадска-культурнага развіцця рэгіёну.

У складзе фамільных архіваў вылучаюцца асноўныя групы крыніц: крыніцы, якія характарызуюць эканамічную дзейнасць прадстаўнікоў роду, матэрыялы аб грамадска-палітычнай дзейнасці прадстаўнікоў роду, асабістыя дакументы, калекцыі. У першай палове XX ст. прыметным становіцца існаванне так званых *сядзібных архіваў*. Да роднасных паняццяў у архівістаў суседніх краін адносяцца тэрміны “памесна-вотчынны архіў” у расіян, “archiwa podworskie” ў палякаў, “маёнткавыя архівы” ў украінцаў. Яны менш значныя, чым фамільныя і выконвалі, у асноўным, эканамічныя функцыі. З 1830-х гг. усё большую

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

значнасць у дзейнасці такіх архіваў набывае сацыяльна-прававая функцыя, абумоўленая неабходнасцю пацвярджэння шляхецкага паходжання. Так, асяродкам захавання гістарычных дакументаў і спадчыны беларускіх дзеячаў становяцца менавіта *сядзібныя архівы*.

Найбольш багатыя калекцыі дакументаў і прадметаў ствараліся на беларускіх землях у XIX ст.: Я. і К.Тышкевічаў у Лагойску, А.Плятара ў Краславе, М.Румянцава ў Гомелі, Э.Чапскага ў Станькаве і інш.

З пункту гледжання крыніцазнаўства, асабісты архіў мае шэраг асаблівасцей, якія вынікаюць са спецыфікі яго стварэння, захавання і выкарыстання. Стварэнне такога архіва носіць характар натуральна-гістарычнага працэсу, які рэгулюецца толькі логікай асабістага жыцця і мае адзіную сувязь паміж яго складовымі часткамі – дапасаванасць да дзейнасці асобы. Паўната і склад крыніц залежаць ад асабістага погляду архівастваральніка на тое, што неабходна захоўваць. Лёсавызначальным можа стаць стаўленне нашчадкаў да архіўнай спадчыны асобы, а таксама гістарычныя падзеі, падчас якіх знішчаюцца крыніцы. Асноўным тыпам крыніц у межах асабістага фонду з'яўляюцца пісьмовыя крыніцы, якія можна аб'яднаць ў тэматычныя групы: крыніцы да біяграфіі, творчай дзейнасці, мемуарныя, эпісталярныя, маёмасна-гаспадарчыя, калекцыі [7, с. 47–55].

Аднак асабістыя архівы, сфарміраваныя без уліку індывідуальнасці стваральніка, навуковых прынцыпаў апісання, не могуць цалкам раскрыць свае скарбы без непасрэднага ўдзелу ў іх фарміраванні прафесійных архівістаў.

Асабістыя архівы – маёмасць іх стваральнікаў і нашчадкаў. Пакуль гэтыя дакументы знаходзяцца на захаванні і ў выкарыстанні вузкага кола людзей, яны не могуць быць даступны шырокаму колу даследчыкаў, не можа быць і гарантыі іх поўнай захаванасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Галоўнымі задачамі захавання архіваў асабістага паходжання з'яўляюцца арганізацыя паступлення іх у дзяржаўныя архівы, навуковае апісанне і выкарыстанне ва ўстаноўленым парадку.

Паняцце архіва асабістага паходжання ў практычнай дзейнасці беларускіх архіваў узнікла параўнальна нядаўна. Да 1950-х г. такія архівы не былі аб'ектамі камплектавання дзяржаўных архіваў Беларусі.

Аднак практыка збірання асабістых архіваў была распачата, былі зроблены першыя спробы іх сістэматызацыі і апісання, створаны перадумовы для арганізацыі камплектавання дзяржаўных архіваў.

Асабістыя архівы найбольш актыўна прымаліся на захоўванне ў музеі ў другой палове XX ст., аднак апрацоўка і ўлік дакументаў асабістага паходжання ў музеях Беларусі разыходзіцца з метадычнымі рэкамендацыямі савецкага перыяду. Нешматлікія цэласныя асабістыя архівы, перададзеныя ў музей архіваўтваральнікам ці яго роднымі, як правіла, патрабуюць дадатковай навуковай архіўнай апрацоўкі, стварэння даведачнага апарату і сістэмы інфармавання аб іх колькасці і складзе.

Захоўванне комплексаў дакументаў асабістага паходжання ў музеях Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца згодна Інструкцыі 1997 г., па якой дакументальныя помнікі, што знаходзяцца на захаванні ў музеях, уваходзяць у склад Нацыянальнага архіўнага фонду (НАФ) і Нацыянальнага музейнага фонду (НМФ). Колькасць цэласных комплексаў дакументаў адной асобы, што маюць самастойную навуковую вартасць і знаходзяцца ў музеях, перавышае 50. На практыцы тэматычная скіраванасць музейнай калекцыі (прынцып пертыненцыі) супрацьпастаўляецца генетычнай цэласнасці архіўнага фонду, асноўнай мэтай стварэння якога з'яўляецца захоўванне найбольш поўнага комплексу дакументаў (прынцып правеніенцыі), і прыводзіць да цяжкасцей ва ўліку, захаванні, доступе да асабістых архіваў ці іх частак у музеях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Для музеязнаўцаў і краязнаўцаў Беларусі вялікую значнасць маюць дакументы заснавальнікаў музейнай справы братоў Я. і К. Тышкевічаў. Род Тышкевічаў вялікі і старажытны, прадстаўнікі яго валодалі шматлікімі маёнткамі і займалі пэўныя пасады. Лагічна, што павінен быў захавацца велізарны фамільны архіў. Аднак у спецыяльнай літаратуры звестак пра архівы гэтага роду зусім няшмат.

У кнізе “Памяць. Лагойскі раён” згадваецца, што маці братоў Тышкевічаў, Аўгуста, была высокаадукаванай асобай і паклонніцай навук. Яна распачала збор калекцый дакументаў, у тым ліку унікальных рукапісаў. Удакладненняў пра склад і змест рукапісаў, на жаль, няма. Увогуле ў нашай літаратуры часцей сустракаюцца звесткі аб лёсе музейных калекцый братоў Яўстафія і Канстанціна Тышкевічаў. Пры знаёмстве са звесткамі аб перамяшчэнні археалагічнай калекцыі ў Румянцаўскі музей можна даведацца, што туды трапілі і матэрыялы раскопак 1862 г. у Мінскім павеце [5].

Пераходзячы да разгляду дакументаў роду Тышкевічаў, якія захоўваюцца ў архівах, трэба адразу пазначыць, што нашыя даследчыкі амаль не спасылаюцца на архіўныя крыніцы. На тэрыторыі Рэспублікі Беларусь дакументаў роду Тышкевічаў як адзінага комплексу архіўных дакументаў не захавалася. Такая сітуацыя звязана з пераездам і дзейнасцю братоў у Вільні; з тым, што прадстаўнікі роду не займалі найвышэйшых пасад і не захоўвалі ў сябе дакументы дзяржаўнага ўзроўню, і з тым, што пісалі на польскай мове. Усе гэтыя акалічнасці і паўплывалі на тое, што пытанне аб рэстытуцыі дакументаў гэтага роду на працягу XX ст. не падымалася.

Цікава, што пры адсутнасці асабістых фондаў братоў Тышкевічаў у Беларусі ў занальным архіве г. Маладзечна захоўваецца асабісты фонд аднаго з даследчыкаў дзейнасці братоў – вядомага гісторыка, краязнаўца, археолага Г.А.Каханоўскага [2, с. 88–91].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А дзе ж захоўваюцца зараз дакументы роду Тышкевічаў? Галоўны збор родавых матэрыялаў прадстаўлены ў Дзяржаўным гістарычным архіве Літоўскай Рэспублікі. Гэта фонд № 716. Яго назва “Асабісты фонд Тышкевічаў”. Прыгаданы збор утрымлівае матэрыялы за перыяд 1451–1881 гг., складаецца з 6703 адз. зах. Сярод фондаў азначанага архіва звесткі пра Тышкевічаў сустракаюцца таксама ў 11 вопісе фонду № 1135 “Віленскае таварыства аматараў навук”. Інфармацыя аб Тышкевічах ёсць і ў фондзе № 1280 “Князі Радзівілы”. Гэта справы №№ 317, 162 (2), 1420, 1484, 2061, 2140.

Яшчэ адно месца захоўвання матэрыялаў – бібліятэка Акадэміі навук Літоўскай Рэспублікі. Звесткі пра Тышкевічаў сустракаюцца ў фондах № 151–1101. Цікавым з’яўляецца той факт, што ў свой час уладальніцай будынка сучаснай бібліятэкі была Клемянціна Тышкевіч, якая арэндавала яго для Віленскага таварыства навукі і мастацтва. У гэтым архіве трэба вывучаць фонд № 148, 296 спраў за 1518–1876 гг. і фонд № 149, 130 спраў за 1774–1912 гг., сярод якіх знаходзяцца дакументы Я.Тышкевіча.

У аддзеле рукапісаў Цэнтральнай бібліятэкі Літоўскай Рэспублікі захоўваецца рукапісны сшытак “Зельнік Барысаўскага павета”, падрыхтаваны Я.Тышкевічам. У згаданым “Зельніку” у алфавітным парадку пералічаны назвы зелак, падаецца характарыстыка іх лекавых і іншых уласцівасцей.

Акрамя прыгаданых архіўных і бібліятэчных устаноў матэрыялы роду Тышкевічаў можна адшукаць у аддзеле рукапісаў бібліятэкі Віленскага універсітэта. Пэўная частка дакументаў аб жыцці і дзейнасці прадстаўнікоў вялікага роду Тышкевічаў захоўваецца ў Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве (дакументы архіва маёнтка Чырвоны Двор), а таксама ў Вроцлаўскім Асалінэўме і бібліятэцы АН Украіны ў Львове [8, с. 173].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падводзячы вынік, можна меркаваць, што будучая праца айчынных даследчыкаў з дакументамі дазволіць высветліць шмат новых фактаў аб адным са знакамітых радоў Беларусі.

---

1. *Архивные* документы Республики Беларусь – сокровища социальной памяти государства:справочник. – Мн., 2005.

2. *Архіўныя* чытанні I–III // Матэрыялы навук. канферэнцый, Мінск 2003–2005 гг. – Мн., 2006. – Вып.1.

3. *Беларускі* археаграфічны штогоднік. – Мн., 2007. – Вып. 8.

4. *Беларускі* археаграфічны штогоднік. – Мн., 2008. – Вып. 9.

5. *Каханоўскі, Г.А.* Археалогія і гістарыяграфічнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст. / Г.А.Каханоўскі. – Мн., 1984.

6. *Палажэнне* аб Нацыянальным архіўным фондзе Рэспубікі Беларусь, 20.09.1996, №3734. У рэд. ад кастрычніка 2002 г., № 513.

7. *Праблемы* гістарыяграфіі, крыніцазнаўства, архівазнаўства і археаграфіі ў Беларусі. – Мн., 2008.

8. *Энцыклапедыя* гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мн., 1993. – Т. 1.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ